средств коммуникации придало человечеству глобальные характеристики, появление же оружия массового уничтожения поставило под вопрос само его будущее существование, гораздо важнее не ориентированная в прошлое вражда и самоизоляция, а «взгляд в будущее» - объединение усилий для охраны окружающей среды, обеспечения рационального природопользования и экономического процветания отстающих регионов. Именно этим целям призвано служить *сохранение исторической памяти*, как основы современного *патриотического воспитания* в системе высшего технического образования Беларуси, на что направлена деятельность соответствующих философско-гуманитарных кафедр и других структурных подразделений.

http://edoc.bseu.by/

*А.Я. Паўлава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*БДУКМ, г.Мінск*
elena_yapavlova@mail.ru

# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ Ў ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ МУЗЕЙНА-ТУРЫСТЫЧНАЙ СФЕРЫ

Важным падмуркам паспяховага развіцця краіны з’яўляюцца захаванне гістарычнай памяці, ахова і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны. Такі падыход дазваляе у выніку дыялогу пакаленняў дасягнуць пераемнасці гуманістычных, патрыятычных і іншых каштоўнасцяў і асаблівасцяў менталітэту беларускага народа.

Актыўнай дзейнасці кафедры гісторыка-культурнай спадчыны БДУКМ у кірунку паглыблення гістарычных ведаў маладога пакалення і пашырэння шляхоў папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны краіны судзейнічаюць навуковыя тэмы кафедры, спецыфіка спецыяльнасці і склад студэнтаў. Кафедра ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці “Музеязнаўства і ахова гісторыка-культурнай спадчыны”. Гэтую сферу дзейнасці выбірае моладзь, якая цікавіцца краязнаўствам і гісторыяй і з’яўляецца патрыётамі роднай зямлі.

Усю работу кафедры можна падзяліць на некалькі кірункаў. Перш за усё, гэта паглыбленне ведаў студэнтаў падчас вывучэння агульнагістарычных і спецыяльных дысцыплін. Засваенне спецыяльнасці пачынаецца з вывучэння гістарычнага краязнаўства. Падчас вывучэння гісторыі краязнаўства на Беларусі студэнты штогадова пішуць эсэ “Краязнаўчыя музеі на маей малой радзіме”. Асаблівасць гэтага задання ў тым, што маючы цікавасць да гісторыі, не ўсе першакурснікі да ўніверсітэта наведвалі свае мясцовыя краязнаўчыя музеі. З мэтай развіцця творчага складніка будучай прафесійнай дзейнасці першакурснікам прапануецца падрыхтаваць праекты-прэзентацыі "Музей, які я хачу стварыць” і “Патэнцыяльныя аб’екты турыстычнага паказу на маёй малой радзіме, якія я прапаную ўключыць у турыстычныя маршруты”. Сёняшнія трэцякурснікі, выконваючы гэтае заданне, у свой час падрыхтавалі невялікія відэа-экскурсіі пра турыстычныя аб’екты г. Мінска: Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі, Асмалоўку, Белую дачу, Чырвоны дворык.

Вывучаючы краязнаўства, студэнты атрымліваюць для самастойнага выказання творчыя заданні, якія прадугледжаваюць вывучэнне музейных экспазіцый. У 2021 г. студэнты малодшых курсаў мэтанакіравана азнаёміліся з выставачнымі праектамі “Беларусь і беларусы” і “Палескі альбом” Нацыянальнага гістарычнага музея і ацанілі ў сваіх эсэ іх патэнцыял для звычайных наведвальнікаў. Супрацоўнікі кафедры зыходзяць з неабходнасці з самога пачатку вучобы далучаць студэнтаў да аналізу існуючых і абмеркавання патэнцыяльных шляхоў актуалізацыі культурнай спадчыны краіны. З гэтай нагоды лагічным выглядала правядзенне заняткаў па музеязнаўству на выставачным

праекце, прысвечаным 100-гадоваму юбілею Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча, у Нацыянальным мастацкім музеі.

Шэраг заняткаў па этналогіі і этнаграфіі Беларусі праводзіцца ў спецыялізаваных музейных установах. Пры вывучэнні тэмы, прысвечанай беларускаму этнасу, студэнты наведваюць Музей старажытна-беларускай культуры Цэнтра даследаванняў традыцыйнай культуры, фонды Чарнобыльскай спадчыны са збору гэтага музея. Адметнасцю вандроўкі ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, разам з вывучэннем этнаграфічных асаблівасцяў розных рэгіёнаў Беларусі, можна назваць канцэнтрацыю на пытаннях аховы, рэстаўрацыі і консервацыі.

Курсам крыніцазнаўства прадугледжваецца дэталёвае знаёмства з рознымі відамі крыніц, якія ўваходзяць у нацыянальны архіўны фонд, нацыянальны музейны фонд і нацыянальны рэестр помнікаў гісторыі і культуры. Падчас заняткаў студэнты наведваюць БДАМЛМ і БДАНТД, дзе вывучаюць творчую спадчыну выбітных дзеячоў культуры (пісьменніка У.Караткевіча, літаратуразнаўцы А.Мальдзіса, кампазітара А. Багатырова), а таксама вядомых архітэктараў, аўтараў аб’ектаў, якія мы зараз лічым нашай спадчынай (І.Лангбарда,Г.Заборскага, У.Караля). Абавязковай часткай заняткаў у БДАНТД з’яўляецца знаёмства дакументальнымі матэрыяламі фонда “Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры”.

Традыцыйнай падзеяй стала правядзенне заняткаў у Музеі кнігі Нацынальнай бібліятэкі Беларусі. Студэнты вывучаюць не толькі матэрыялы для пісьма і кніжную спадчыну мінулых стагоддзяў, але і знаёмяцца з дзейнасцю выбітных краязнаўцаў. У мінулым годзе праз выставы “Руплівец сівой даўніны”, прысвечаную дзейнасці А.П.Сапунова, і “Бібліятэка Храптовічаў” адбыўся своеасаблівы дыялог пакаленняў: студэнты атрымалі магчымасць дакрануцца да спадчыны выбітнага краязнаўцы і гісторыка, пачуць гісторыю вяртання ў Беларусь часткі лістоў з Бібліятэкі Храптовічаў.

Неабходным кампанентам патрыятычнага і гістарычнага выхавання студэнцкай моладзі з'яўляецца вывучэнне гісторыі фарміравання дзяржаўнай сімволікі нашай краіны. Асобнае месца ў Год гістарычнай памяці набывае і зварот да геральдычнай спадчыны адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Беларусі. У вучэбным плане па "Геральдыцы" гэтым пытанням адводзіцца значнае месца. Студэнты рыхтуюць і прадстаўляюць прэзентацыі, прысвечаныя геральдычным сімвалам сваёй малой радзімы. Зварот да больш глыбокага вывучэння геральдычнай спадчыны роднага горада, вёскі, вобласці ці раёна фарміруе ў студэнтаў кафедры патрыятычныя пачуцці і разуменні значнасці дачынення да багатай гісторыі нашай радзімы.

На трэццім курсе ў працэсе засваення дысцыплін турыстычнай накіраванасці студэнты атрымліваюць магчымасць самім аналізаваць стан і перспектывы ўключэння ў маршруты ў якасці аб’ектаў для паказу славутясцяў Беларусі. Такая дзейнасць традыцыйна адбываецца ў працэссе вывучэння “Турыстычны патэнцыял Беларусі”, “Тэорыя і практыка экскурсійнай работы” і ўяўляе стварэнне студэнтамі аўтарскіх мультымедыйных праектаў краязнаўчай скіраванасці з самастойным выбарам аб’ектаў для паказу. На адной з дзяржаўных моў студэнты 4 курса падрыхтоўваюць аглядныя экскурсіі па сталіцы. Сярод папулярных у студэнтаў экскурсіных напрамкаў можна вызначыць наступныя: “Чыгуначны вакзал – Плошча Незалежнасці”, “Кастрычніцкая плошча”, “Гарадская скульптура”, “Цікавосткі гістарычнага цэнтра”, “Сталінскі ампір на Праспекце незалежнасці”, “Купалаўскія мясціны”, “Акварэлькі Лошыцы”.

Эпідэмічная сітуацыя 2020 г. ускладніла і змяніла традыцыйны кірунак правядзення вучэбных экскурсій. У склаўшыхся эпідэмічных умовах выйсце было знойдзена ў стварэнні відэаэкскурсій групамі па 3-4 чалавекі. Так атрымаліся даволі прыстойныя ролікі “Вандроўкі па Раманаўскай слабадзе”, “Куточкі Траецкага прадмесця”, а таксама былі распрацавалі маршруты для выяздных экскурсій “Невядомая Беларусь. Помнікі прыроды і архітэктуры Міёрскага раёну”, “Шляхам каталіцкіх святынь”, “Вандроўка па беларускаму Версалю”. Вывучаючы спецыяльную тэрміналогію на замежнай мове па тэме “Гісторыка-

культурная спадчына Беларусі”, студэнты атрымліваюць шанс падрыхтаваць экскурсіі па самых знакавых аб’ектах для англамоўных турыстаў.

Да 90-годдзя са дня нараджэння У.С.Караткевіча, аднаго з найбольш яскравых фігур у беларускай літаратуры другой паловы ХХ ст., на кафедры быў падрыхтаваны экскурсійны маршрут “Мінскія адрасы У.Караткевіча”. Экскурсія была паспяхова праведзена для студэнтаў 1 курса музейнай спецыяльнасці.

Значна спрыяе папулярызатарскай дзейнасці кафедры створаны ў 2017 г. на базе ўстановы “Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы” філіял кафедры. Ён дазваляе у працэссе правядзення заняткаў і арганізацыі пазавучэбных мерапрыемстваў максімальна наблізіць студэнтаў да вывучэння і папулярызацыі спадчыны аднаго з выбітнейшых дзеячоў культуры Беларусі (нашыя студэнты штогадова з’яўляюцца удзельнікамі “Ночы музеяў” і іншых праектаў у гэтай установе).

Другім кірункам можна вызначыць акцэнтаванне ўвагі студэнтаў на аб’ектах нашай спадчыны і пры падрыхтоўцы курсавых работ па гісторыі Беларусі. Як паказаў аналіз абраных тэм, на працягу многіх гадоў цікавасць у студэнтаў выклікае гісторыка-культурная спадчына вялікіх і малых гарадоў (Слуцк, Тураў, Гомель, ) і раёнаў Беларусі (Бярозаўскі, Гомельскі, Калінкавіцкі, Пастаўскі, Пінскі, Смаргонскі). У гэтым кантэксце папулярнай тэмай курсавых і нават дыпломных работ можна пазначыць розныя аспекты музеефікацыі і актуалізацыі архітэктурнай спадчыны краіны. Сярод работ можна вызначыць помнікі сакральнай архітэктуры Гродзенскай вобласці, архітэктура г.Брэста і раённых цэнтраў вобласці, замкі і замкавыя комплексы Беларусі. У дакавідны перыяд на адным з бонусаў на занятках па гісторыі архітэктуры традыцыйна была аўтарская экскурсія дацэнта А.А.Трусава па гістарычнаму цэнтру г.Мінска да Сусветнага дня архітэктуры. У бягучых абставінах гэтую экскурсію замянілі на віртуальныя вандроўкі па замках Беларусі, якія А.Трусаў даследаваў як археолаг і гісторык.

Неабходна адзначыць, што цікавасць да краязнаўства атрымлівае працяг і ў далейшых даследаваннях нашых студэнтаў падчас напісання імі магістарскіх дысертацый. Штогадова студэнты прадстаўляюць вынікі сваіх пошукаў на ўніверсітэцкай канферэнцыі “Культура вачыма маладых”. Даследаванні, прысвечаныя дзейнасці музеяў Беларусі па музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны раёнаў, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС і музеефікацыі сядзібна-паркавых комплексаў Рэспублікі Беларусь завершыліся паспяхова абароненымі кандыдацкімі дысертацыямі. Напрацоўкі па тэмах “Актуалізацыя сядзібна-паркавых комплексаў Гродзенскай вобласці” і “Фарміраванне культурнай памяці аб Першай сусветнай вайне на тэрыторыі Беларусі” атрымалі працяг у магістраскіх дысертацыях і былі прадсталены на Першым краязнаўчым форуме.

Наступным кірункам дзейнасці па пашырэнню ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне краіны з’яўляецца практыка студэнтаў. Хочацца адзначыць, што кафедры не губляе сувязі з нашымі выпускнікамі. Асноўнай базай археолага-этнаграфічнай практыкі 1 курса з'яўляецца Дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Пад кіраўніцтвам загадчыка аддзела археалогіі сярэдніх стагоддзяў і Новага часу, кандыдата гістарычных навук А. В. Вайцяховіча, студэнты прымаюць ўдзел у археалагічных раскопках у г. Заслаўе і вывучаюць методыку апрацоўкі археалагічных знаходак. Такім чынам, студэнты ўжо на 1 курсе далучаюцца да вывучэння гісторыка-культурнай спадчынай краіны.

Азнаямляльная музейная практыка на 2 курсе мае сваёй мэтай прадставіць студэнтам магчымасць дэталёва знаёмяцца з музейнымі ўстановамі ўсіх відаў: Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь і яго філіялы, уключаючы Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, Музей гісторыі г.Мінска і яго філіялы, Нацыянальны мастацкі музей, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і яго філіялы, Дзяржаўны літаратурны музеем Я.Коласа, Музей-майстэрня З.Азгура, Музей У.Мулявіна. У якасці экскурсаводаў, як правіла, выступаюць выпускнікі кафедры, што ператварае экскурсіі ў

своеасаблівыя майстар-класы і забяспечвае эфектыўную перадачу ведаў аб беларускіх славутасцях.

Зразумела, што ў адведзеныя вучэбныя гадзіны немагчыма ўмясціць усе тыя веды і навыкі, якімі выкладчыкі жадаюць падзяліцца са студэнтамі. Як варыянт пазавучэбнай дзейнасці на кафедры на працягу некалькіх гадоў дзейнічае гурток "Пазнай Беларусь". Асноўнымі яго ўдзельнікамі з'яўляюцца студэнты 2-4 курсаў. Сустрэчы гуртка часта адбываюцца ў форме майстар -класаў выпускнікоў кафедры, супрацоўнікаў музейных устаноў г.Мінска В.Сідаровіча, Ю.Кавалёвай (Музей гісторыі г.Мінска), І.Захара, К.Навіцкай (БДМГВАВ), Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (Т.Дземідовіч), Д.Міхеева (Музей-майстэрня З.Азгура) і г.д.

Намаганнямі экскурсійна-краязнаўчага аб'яднання штогод ладзяцца падарожжы студэнтаў і выкладчыкаў па рэгіёнах Беларусі з наведваннем аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Экскурсіі падчас падарожжаў праводзяць студэнты-гурткоўцы. На працягу апошніх гадоў члены краязнаўчага гуртка наведалі гарады Гомель, Брэст, Віцебск. На занятках гуртка студэнты музейнай спецыяльнасці атрымліваюць магчымасць праявіць свае творчыя здольнасці ў распрацоўцы і арганізацыі экскурсійнай дзейнасці. Як правіла, імі прапаноўваюцца маршруты пешаходных экскурсій па сталіцы ці загарадных экскурсій аднаго дня. У якасці кансультантаў для гурткоўцаў запрашаюцца выпускнікі кафедры, сертыфікаваныя Нацыянальным агенствам па турызму экскурсаводы Васіль Сідаровіч і Павел Каралёў. Маршруты вандровак падчас экскурсійнай практыкі з курса таксама распрацоўваюцца студэнтамі. У бягучым годзе запланавана вандроўка па маршруце: Мінск – Баруны – Кушляны - Гервяты – Жодзінкі – Плебань - Мінск.

Падводзячы высновы, можна адзначыць, што культурная спадчына і краязнаўча-турыстычная дзейнасць маюць цесную сувязь. Рознабаковыя намаганні кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў музейнай і турыстычна-краязнаўчай сферы судзейнічаюць фарміраванню прафесіяналаў, здольных з любоўю прадставіць нашую спадыну гасцям Беларусі.

http://edoc.bseu.by/

*Л.И. Подгайская, кандидат социологических наук, доцент,*
*БГЭУ, г. Минск*
podgaiskaiaa@tut.by

## ВОСПИТАНИЕ ПАТРИОТИЗМА У СТУДЕНТОВ С ПОМОЩЬЮ НЕФОРМАЛЬНЫХ ФОРМ РАБОТЫ

Молодой специалист XXI века должен быть не только разносторонне образован, обладать широким кругозором профессионала, но и быть ответственным гражданином, патриотом своей страны. Для достижения этих целей студенту необходимо накопление определенного опыта социальной и гражданской идентификации. И в этом деле, наравне с учебной деятельностью, студентам очень помогает неформальная работа.

Многолетний опыт кураторской работы со студентами БГЭУ показал, что наиболее успешными формами формирования социальных и гражданских компетенций у студентов являются следующие виды неформальной работы: встречи с интересными людьми, студенческие фестивали, экскурсии по историческим местам нашей страны, а также такая форма, как «Равный обучает равного».

Чтобы сформировать у студентов интерес к избранной специальности и быстрее привлечь их к научно-исследовательской работе мы используем такой вид неформальной работы как приглашение на круглые столы известных людей. Так, например, с нашими студентами-социологами встретились профессор, доктор социологических наук, зав.